ОКОГУ 02193

ТРАНСПАРТНАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ УНІТАРНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

**МІНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ**

вул. Свярдлова, 28, 220030, г. Мінск
Тэл. (017) 225 33 12, факс (017) 327 05 12
E-mail: nod1@rwminsk.by
Р.р. 3012600180015 ф-л 527 «Белжелдор»
ААТ «ААБ Беларусбанк» код 254 г. Мінск
УНП 100003499 АКПА 01063928

ТРАНСПОРТНОЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ

**МИНСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ**

ул. Свердлова, 28, 220030, г. Минск
Тел. (017) 225 33 12, факс (017) 327 05 12
E-mail: nod1@rwminsk.by
Р.с. 3012600180015 ф-л 527 «Белжелдор»
ОАО «АСБ Беларусбанк» код 254 г. Минск
УНП 100003499 ОКПО 01063928

22.02.2017 № 71-СО-19/Кол-151

На № __________ ад ____________

Аб разглядзе звароту

Ваш зварот разгледжаны ва УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі".

Інфармуем Вас, што згодна з артыкулам 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. №3094-XI "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і артыкуле 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы, якія маюць роўныя правы.

Па пытанні прадастаўлення інфармацыі з выкарыстаннем беларускай мовы на маніторах, якія ўжываюцца ў цягніках, паведамляем, што сістэма «Mitron», усталяваная ў цягніках, разлічана на выкарыстанне толькі рускай мовы.

У адпаведнасці з дзеючымі нарматыўнымі дакументамі аб'явы ў цягніках розных катэгорый па сістэме гучнай абвесткі выраблюоцца як на рускай, так і на беларускай мове. Для цягнікоў рэгіянальных ліній эканамкласа усталявана для выкарыстання беларуская мова.

У дадатку 5 да загаду ад 15.10.2012 №1010НЗ "Аб зацвярджэнні адзінага рэгламенту перадачы інфармацыі па сетцы гучнай абвесткі і размяшчэння візуальнай інфармацыі ў цягніках» выкладзена, што пры наяўнасці ў цягніку аўтаматызаваных маўленчых інфарматараў, інфармаванне пасажыраў з выкарыстаннем сеткі гучнай абвесткі цягнікоў можа ажыццяўляцца на беларускай мове, тым самым не забараняе выкарыстання рускай мовы.

У частцы прымянення розных моў пры передачы аб'яваў на чыгуначных вакзалах паведамляем наступнае.

У адпаведнасці з загадам ад 27.09.2013 №928НЗ «Аб зацвярджэнні адзінага рэгламенту інфармацыйнага забеспячэння пасажыраў на вакзалах,

Д № 008334

станцыях і прыпыначных пунктах Беларускай чыгункі» перадача аўдыёпаведамленняў на чыгуначных вакзалах ажыццяўляецца на беларускай і рускай мовах, а на вакзалах станцый Мінск-Пасажырскі і Брэст-Цэнтральны на трох мовах (беларускай, рускай і англійскай) для цягнікоў, якія ідуць у краіны далёкага замежжа.

Носьбіты візуальнай інфармацыі на вакзалах станцый Мінск-Пасажырскі, Гродна, Брэст-Цэнтральны, у адпаведнасці з названым дакументам, выкананыя на беларускай і англійскай мовах.

Тлумачым, што Вы маеце права абскардзіць рашэнне, прынятае па звароту, у вышэйстаячую арганізацыю (дзяржаўнае аб'яднанне «Беларуская чыгунка», г.Мінск, вул.Леніна, 17).

Намеснік
начальніка аддзялення І.І. Грыбанаў